*В. А. ШАРШУНОЎ*

# ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ НАВУКІ, АДУКАЦЫІ І ВЫТВОРЧАСЦІ

Пераход Рэспублікі Беларусь да рыначнай эканомікі, безумоўна, патрабуе ўдасканалення сістэмы ўзаемных сувязяў навукі, адукацыі і вытворчасці ў аграрным сектары, сеткі і структуры НДІ, ВТІ, ВНУ, тэхнікумаў, эксперыментальных прадпрыемстваў, вытворчасцяў, баз, доследна-эксперыментальных і вучэбна-доследных гаспадарак, сельскагаспадарчых доследных станцый як рэспубліканскага і абласнога, так і ведамаснага падпарадкавання. Аднак, вырашаючы складаныя задачы сучаснага жыцця нашага грамадства, неабходна зрабіць усё, каб захаваць усё тое лепшае, чым валодае рэспубліка, што было зроблена працай не аднаго пакалення людзей. Перш за ўсё гэта датычыцца навуковага патэнцыялу, які актыўна працуе ў навуцы і адукацыі.

Для сучаснага этапу развіцця сельскай гаспадаркі характэрны стан раздробненасці трох складаючых: навукі, адукацыі і вытворчасці. На жаль, склалася так, што кожная галіна ў рамках былога СССР развівалася ў значнай ступені адасоблена, з абмежаваным кантактаваннем адна з адной і то толькі па асобных пытаннях. Прапановы навукі мелі і маюць пакуль яшчэ характар рэкамендацыі, іх аўтары не неслі і не нясуць адказнасці за негатыўныя наступствы на вытворчасці і ў адукацыі.

Заканадаўчая база, якая рэгламентуе кантакты гэтых складаючых па выкарыстанні дасягненняў адна адной, у значнай ступені адстае ад рэальнага жыцця. Дастаткова адзначыць, што вынікі навуковых даследаванняў не могуць, згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, выступаць таварам. У рэспубліцы зроблены ў гэтым накірунку толькі першыя крокі і то толькі ў вобласці насенняводства сельскагаспадарчых культур, сортавыпрабаванні і племянной справе ў жывёлагадоўлі. Інтарэсы ж аўтараў новых тэхналогій, спосабаў, тэхналагічных прыёмаў, аперацый ды і машын не абаронены з пункту погляду атрымання дэвідэндаў ад вынікаў укаранення ў вытворчасць. З другога боку, няма стымулаў у вытворцаў да ўкаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу ў вытворчасць. У гэтых умовах кіраўніцтву ААН Рэспублікі Беларусь неабходна ўзяць на сябе ролю каардынатара намаганняў вучоных на распрацоўку не толькі прапаноў, як упарадкаваць сетку і структуру навуковых падраздзяленняў і навучальных устаноў, але і падрыхтоўку адпаведнай заканадаўчай базы ў выглядзе праектаў законаў для Вярхоўнага Савета, а таксама праектаў нарматыўных дакументаў для адпаведных міністэрстваў і камітэтаў. Ніхто лепш за саміх вучоных-аграрнікаў не ведае свае праблемы і як абараніць сябе і вынікі сваёй працы.

Як сведчыць вопыт развіцця аграрнай навукі і адукацыі ў краінах

Заходняй Еўропы і Амерыкі, лепшай формай іх арганізацыі з'яўляюцца універсітэты. Ва ўмовах заходніх універсітэтаў вучоны-аграрнік выступае ў трох ролях: вучонага, выкладчыка і менеджэра вынікаў сваіх навуковых даследаванняў. Пры гэтым рэзультатыўнасць кожнага віду прац стымулюецца матэрыяльна і з'яўляецца крытэрыем пры ўсемагчымых атэстацыях, у тым ліку і пры павышэнні па службе. Па гэтым накірунку фарміруецца сістэма навукі і адукацыі ў краінах Усходняй Еўропы. Гэта звязана са значным скарачэннем ліку вучоных, прычым на першай стадыі іх найбольш прадукцыйнай і маладой часткі, здольнай хутка зарыентавацца пры зменах эканамічнай сітуацыі і знайсці сабе іншае выкарыстанне.

Але тое, што можна зрабіць ва ўмовах Усходняй Германіі, калі на тэрыторыі былой ФРГ застаецца стабільна працуючы і высокакваліфікаваны сектар адукацыі і навукі, нельга зрабіць у нас у рэспубліцы без узнікнення крытычнай сітуацыі. У сувязі з гэтым для нас пакуль што больш прымальны шлях Расіі і Украіны, шлях пошуку аптымальнага спалучэння НДІ і ВНУ і абслугоўваючай іх базы, іх памераў і колькасці. Роля Прэзідыума ААН як каардынатара, так і гаранта стабільнага і цывілізаванага пераходу ад адной сістэмы да другой з пункту погляду адказнасці перад народам і дзяржавай, а таксама перад нашай гісторыяй надзвычай вялікая. І гэтую ролю кіраўніцтву акадэміі неабходна на сябе ўзяць і актыўна ўмешвацца ў працэс удасканалення сектара, адначасова абараняючы яго ад неабгрунтаваных нападак і скарачэнняў, каб дагадзіць чыімсьці кан'юнктурным інтарэсам.

Важнейшым накірункам працэсу інтэграцыі навукі і адукацыі застаецца ўзаемная павага ў абедзвюх галінах вучоных. Пакуль што існуючы стан нагадвае рух з аднабаковым кірункам. Першымі, на наш погляд, гэта зразумелі ў ВНУ рэспублікі, такіх, як БАТУ, БСГА і інш. У іх на ўмовах пагадзіннай аплаты або сумяшчальніцтва прымаюць удзел у навучальным працэсе вядучыя вучоныя аграрных НДІ. Аднак з боку гэтых НДІ няма жадання ўключаць у свае праграмы даследаванняў вучоных з ВНУ. Больш за тое, пры перамозе на конкурсных пачатках фінансаванне па ААН ажыццяўляецца праз галаўныя НДІ ў галіны, г. зн. пасля перамогі лёс фінансавання, яго своечасовасць і перыядычнасць чамусьці аддаюцца тым, каго перамаглі. Адсюль парадоксы. Так, у 1994 г. першыя грашовыя паступленні ў навукова-даследчую частку БСГА па агранамічнай і эканамічнай тэматыцы паступілі толькі ў канцы ліпеня, а справаздачы па НДР сталі патрабаваць у кастрычніку.

Нам зразумелыя сучасныя цяжкасці жыцця НДІ, аднак правядзенне навукова-даследчых работ у ВНУ грунтуецца на тых жа прадпасылках: на камандзіроўках і працы абслугоўваючага персаналу, закупцы ўгнаенняў, сродкаў аховы, апрацоўцы зямлі, сяўбе, уборцы ўраджаю, апрацоўцы доследных даных і г. д. А гэта патрабуе затрат. У сувязі з гэтым, на наш погляд, адкрыццё фінансавання ВНУ па НДР трэба было б ажыццяўляць праз Галоўнае ўпраўленне па эканоміцы ААН Рэспублікі Беларусь, а кантроль за ўзроўнем метадычнай работы пры правядзенні навукова-даследчых работ, а таксама прыём доследаў, справаздач, рэцэнзаванне, заключэнне пра мэтазгоднасць правядзення тых або іншых даследаванняў, разгляд праграм і методык даследаванняў — з боку НДІ. Тады быў бы захаваны прынцып раўнапраўнасці вучоных ВНУ і НДІ, іх роўныя магчымасці пры забеспячэнні НДР. А пакуль што гэтага няма.

Безумоўна, у рэспубліцы застаецца недавыкарыстаным рэзерв — гэта патэнцыял работнікаў ВНУ. Так, у БСГА на сённяшні дзень працуюць 23 дактары і каля 300 кандыдатаў навук па ўсім спектры не толькі аграрных спецыяльнасцяў, але і шмат якіх іншых накірункаў. Пры гэтым сярод іх прадстаўнікі практычна ўсіх навуковых школ былога СССР і за імі стаіць 155-гадовы вопыт гісторыі гэтай навучальнай

установы. У БСГА вельмі шмат рабілася і робіцца ўпершыню. Гэта і першы доктар аграноміі, першы дрэнаж, першы прататып збожжаўборачнага камбайна, першае ў свеце доследнае поле, першая вучэбная жывёлагадоўчая ферма і шмат што іншае, у тым ліку падручнікі, манаграфіі, па якіх вучыліся і вучацца студэнты навучальных устаноў не толькі рэспублікі, але і СНД.

На жаль, у асобных супрацоўнікаў НДІ бытуе думка пра непаўнацэннасць навуковых даследаванняў работнікаў ВНУ. На наш погляд, гэта далёка не так. Дасягненні вучоных ВНУ агульнавядомыя. У іх больш глыбокі ўзровень тэарэтычнай прапрацоўкі тых або іншых палажэнняў. На карысць такіх довадаў дастаткова спаслацца на наступныя прыклады.

У БСГА пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча навукі рэспублікі, прафесара Г. І. Таранухі даўно і паспяхова працуе група вучоных-селекцыянераў па стварэнні высокаўраджайных сартоў зернебабовых культур. Супрацоўнікамі кафедры біятэхналогіі і экалогіі ў раслінаводстве пад кіраўніцтвам доктара біялагічных навук А. В. Кільчэўскага на аснове метадаў біятэхналогіі створаны шэраг новых сартоў таматаў, а таксама пад яго кіраўніцтвам эфектыўна працуе біятэхналагічная вучэбная лабараторыя па вытворчасці насеннай бульбы, суніц, буракоў і іншых культур на бязвіруснай аснове. У 1995 г. паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю ў вобласці біятэхналогіі ў жывёлагадоўлі дацэнт Н. Х. Фядосава. Вядомы сваімі працамі ў гэтым накірунку прафесар Г. Ф. Мядзведзеў. Дастаткова адзначыць, што названыя вышэй вучоныя ўваходзяць у той невялікі лік спецыялістаў у межах СНД, якія займаюцца гэтым крайне важным для будучага аграрнай навукі накірункам. Сярод іншых, заслугоўваючых асаблівай увагі, навуковыя накірункі пад кіраўніцтвам прафесараў А. З. Латыпава, А. І. Гарбылёвай, Н. В. Радзько, В. С. Доўнара, дацэнтаў А. Р. Цыганова, М. В. Шалака, І. Р. Вільдфлуша і шэрагу іншых вучоных БСГА. Безумоўна, гэтыя працы вартыя самай пільнай увагі з пункту погляду перш за ўсё практычнай накіраванасці на вырашэнне актуальных пытанняў сучаснай вытворчасці.

Шырока вядомы ў рэспубліцы распрацоўкі вучоных-эканамістаў па пытанні рэфармавання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. У апошні час пад кіраўніцтвам новага дырэктара БелНДІ эканомікі і інфармацыі праároблена значная праца ў гэтым накірунку. Нельга не канстатаваць поспехі вучоных гэтага НДІ, аднак усё ж вопыт у гэтым пытанні старэйшай ВНУ нельга ігнараваць, як гэта робіцца зараз. Ідэя пошуку рацыянальных формаў гаспадарання ў сельскай гаспадарцы на працягу ўсёй 155-гадовай гісторыі БСГА была прывабнай для вучоных-педагогаў. Першы доктар агранаміі А. В. Саветаў, прафесар І. А. Сцебут і шмат хто іншыя былі сааўтарамі рэформаў, пачынаючы з адмены прыгоннага права, «сталыпінскай» рэформы і заканчваючы ідэяй сучаснага акцыяніравання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. У гады пасля грамадзянскай вайны ў БСГА працаваў Д. Ф. Прышчэпаў — былы Нарком земляробства рэспублікі. Ім была абгрунтавана мадэль кааперыравання сялянскіх гаспадарак. У 30-я гады бягучага стагоддзя ў БСГА выкладаў дацэнт Кіслякоў (на жаль, зараз нават ініцыялы гэтага педагога нельга ўстанавіць). Яму належыць мадэль стварэння ў сельскай гаспадарцы пасёлкаў з 8—10 сялянскіх гаспадарак, аб'яднаных на дабраахвотных пачатках калектыўнай формай кіравання. У аснову гэтых мадэляў была пакладзена прыватная ўласнасць на зямлю і іншыя асноўныя сродкі вытворчасці ў спалучэнні з калектыўнай уласнасцю на перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі і тавары, гатовыя для спажывання. З-за неадпаведнасці гэтых распрацовак праграме калектывізацыі абодва выкладчыкі былі рэпрэсіраваны.

Прамым працягам гэтага навуковага накірунку, на наш погляд, з'яўляюцца распрацоўкі групы выкладчыкаў эканамічнага факультэта

пад кіраўніцтвам прарэктара па навукова-даследчых работах Э. А. Пятровіча. Ён у 1987 г. выказаў ідэю магчымасці акцыянавання калгасаў на аснове долевых паёў і ў 1988 г. на базе гэтых распрацовак было праведзена пераўтварэнне калгаса імя Свярдлова Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў СГТ «Горацкае», г. зн. тады, калі сама ідэя рэфармавання калгасна-саўгаснай маёмасці ў структуры рынычнага тыпу ў лепшым выпадку выклікала неразуменне нават у тых, хто сёння з'яўляецца прыхільнікам рэформаў, і хто лічыць сябе іх аўтарам. У сувязі з гэтым трэба адзначыць мэтанакіраванасць і паслядоўнасць дзеянняў старшыні калгаса А. П. Герасімава, а таксама падтрымку цяперашняга Міністра Мінсельгасхарчу Рэспублікі Беларусь В. С. Лявонава, які працаваў у тыя гады ў Магілёўскай вобласці.

Гэтая група вучоных знайшла паслядоўнікаў першых доследаў. Сёння з іх удзелам у 26 гаспадарках, якія знаходзяцца на рознай ступені ўкаранення, праводзіцца акцыянаванне. Сярод іх — калгасы Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Пры гэтым у залежнасці ад жадання работнікаў выкарыстоўваюцца розныя мадэлі і варыянты сельскагаспадарчых акцыянерных таварыстваў, сельскагаспадарчых аб'яднанняў, кааператываў і прыватных сялянскіх гаспадарак, сельскагаспадарчых народных прадпрыемстваў, сельскагаспадарчых асацыяцый акцыянерных суполак і таварыстваў, таварыстваў з абмежаванай адказнасцю і г. д. Выбар арганізацыйна-прававых формаў гаспадарання ўлічвае аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары і перш за ўсё ўзровень унутрыгаспадарчых эканамічных адносін.

Трэба адзначыць, што ў БСГА распрацаваны неабходныя ўстаноўчыя дакументы, якія прайшлі адпаведную апрабацыю і дапрацоўку. Сярод іх — Палажэнне пра выкарыстанне маёмасных паёў, Статут для народнага сельскагаспадарчага прадпрыемства, Метадыка пераацэнкі маёмасных паёў, Палажэнне пра фінансава-разліковы цэнтр, Устаноўчая дамова для стварэння суполак з абмежаванай адказнасцю, Устаноўчая дамова акцыянернага таварыства, Статуты суполкі і акцыянернага таварыства, Палажэнне пра ўнутраны аукцыён матэрыяльных рэсурсаў (кармоў, маладняку жывёлы, насення і г. д.) і інш.

Прапануемыя мадэлі мяркуюць эвалюцыйны шлях пераўтварэння калгасаў і саўгасаў у сельскагаспадарчыя прадпрыемствы з сумеснай (долевай) і прыватнай уласнасцю ў спалучэнні з калектыўнай формай арганізацыі працы. Пры гэтым права ўласнасці кожнага работніка рэалізуецца праз паявыя долі і акцыянерныя адносіны, што замацоўвае магчымасць атрымання ім дадатковых прыбыткаў у выглядзе працэнтаў або дывідэндаў на свой укладзены капітал з улікам працоўнага ўдзелу. Магчымасць продажу і куплі маёмаснай долі (акцый) стварае ўмовы для паступовай канцэнтрацыі капіталу ў групы ўласнікаў за кошт кантрольнага пакета акцый.

На наш погляд, такі падыход да рэфармавання дазваляе захаваць дасягнуты калгасамі і саўгасамі ўзровень механізацыі калектыўнай працы, нарміраваны працоўны дзень, сістэму сервіснага абслугоўвання і рамонту тэхнікі, сацыяльныя гарантыі для працуючых членаў і пенсіянераў, а таксама ўзровень сацыяльна-культурнага і бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва. Адначасова ў працуючых павышаецца зацікаўленасць у канчатковым выніку, імкненне да зніжэння затрат і росту прадукцыйнасці працы, г. зн. тое, што характэрна прыватнаму ўласніку. Пра гэта пераканаўча сведчаць ужо першыя поспехі акцыянерных гаспадарак, утвораных на базе калгасаў і саўгасаў. У іх павышаецца патрэба ў канкрэтных выніках навуковых даследаванняў.

Акрамя гэтай групы вучоных у БСГА над рознымі пытаннямі тэорыі і практыкі рэфармавання сельскай гаспадаркі працуюць член-карэспандэнт ААН Рэспублікі Беларусь І. І. Ляньκоў, прафесар В. С. Абуховіч, дацэнты К. К. Шэбека, В. А. Вераб'ёў, М. К. Жудро, В. В. Быкаў, А. А. Баканаў і інш. Можна было прывесці і шэраг іншых прыкладаў

паспяховай працы вучоных сельскагаспадарчых ВНУ. Значыць, Прэзідыум Акадэміі аграрных навук павінен прыняць усе меры, каб аб'яднаць намаганні вучоных НДІ і ВНУ на вырашэнні актуальных пытанняў у АПК. Гэта шлях павышэння ролі ААН Рэспублікі Беларусь і для гэтага ёсць усе неабходныя прадпасылкі. Задача заключаецца ў імкненні рэалізаваць гэтыя прадпасылкі, паколькі часу на адны разважанні ўжо не засталося. У адваротным выпадку пагоршанне сітуацыі ў аграрным сектары незваротна прывядзе да зніжэння занятасці ААН як каардынатара намаганняў вучоных-аграрнікаў і да некіруемага працэсу скарачэння сістэмы навуковага і кадравага забеспячэння сельскай гаспадаркі.